Цана асобнага нумару 20 грошаў.

Opłatę pocztową uiszczono ryczałtem.

НАША ПРАЎДА

Выходзіць два разы у тыдзень.

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі: Вільня, Віленская вул. 12—6 (Wileńska 12. m. 6) Рэдакцыя адчынена ад 12 да 2 гадз. штодня, апрача сьвяточных дзён. Адміністр. ад 9 да 3.

Падпіска на адзін месяц з дастаўкай да хаты 1 зл. 50 гр. Для заграніцы ўдвая даражэй. Перамена адрэса 30 гр.

Няпрынятыя ў друк рукапісы назад не вяртаюцца. Аплата надрукаванага залежыць ад Рэдакцыі.

Цана абвестак: перад тэкстам 25 грош., сярод тэксту 20 грошы і на 4 стр. 15 гр. за радок пэтыту ў 1 шпальту.

№ 5 Вільня, Аўторак 12-га красавіка 1927 г. Год I

Прадвесьнікі выбараў.

Ня гледзячы на тое, што да выбараў у новы Сойм і Сэнат Польшчы ў найлепшым выпадку йшчэ больш за паўгоду, а мо' й цэлы год, як пішуць польскія газэты,—аднак, падгатоўка да выбарнае кампаніі ўжо йдзе.

Ідзе яна перадусім у польскіх партыях. Усе яны ўсьцяж адбываюць нарады і зьезды, выдумляючы розныя спосабы прывабліваньня да сябе выбаршчыкаў. Асабліва стараецца ў гэтым кірунку партыя ППС (Польская Партыя Сацыялістычная), якая займаецца тым, што ўвесь час цішком падтрымлівала і падтрымлівае буржуазныя ўрады, а голасна заяўляе аб сваей „апазыцыйнасьці“ да іх! Вялізарнае ажыўленьне бачым мы і сярод эндэцкае правіцы, і сярод хадэкаў, пястоўцаў ды інш. Урэшце, спасярод былых сяброў Незалежнае Хлопскае Партыі (пасла Воевудзкага), зьліквідаванае ўрадам адначасна з Грамадой, выдзялілася „лёяльная“ група, зложаная з паслоў Бона, Шапеля і Шакуна, якая рыхтуецца да выбарнае кампаніі пад новай фірмай — „Радыкальнай Хлопскай Партыі“, ды пад новым сьцягам, варожым да „выврotовых“ імкненьняў НПХ.

Тое-ж бачым мы і сярод беларусаў. Першай праявай блізкасьці выбараў была, бясспрэчна, ліквідацыя ўрадам Грамады. Адначасна з гэтым адбылося аб'яднаньне ўсяе беларускае „правіцы“ — сельсаюзьнікаў, хадэкаў і „палёнофілаў“ featured рознага гатунку, яркае выяўленьне чаго бачылі мы на банкеце ў рэстаране Жоржа, дзе 25 сакавіка супольна заселі за банкетны стол прадстаўнікі ўсіх гэных групаў. Урэшце, трэба адзначыць выхад раду новых палітычных часопісяў у беларускай мове, як „Беларускі Дзень у Вільні і „Беларуская Доля“ ў Горадні, выдаваных „палёнофіламі“, ды канфіскацыі незалежнае беларускае радыкальнае прэсы, у апошнім часе асабліва частыя.

Аб'яднаньне групаў з буржуазна-палёнофільскай ідэалёгіяй, як гэта ні дзіўна, адбылося пад сьцягам... незалежнасьці Беларусі! Дзіўна ня тое, што прадстаўнікі буржуазнае ідэалёгіі хочуць гэтак адвярнуць увагу нашых масаў ад цяжкое сучаснасьці і змаганьня за сацыяльнае вызваленьне працоўных, — а тое, што робіцца гэта групамі, якія знаходзяцца ў поўным паразуменьні з польскімі ўладамі. Але дзіўна толькі на першы пагляд: бо-ж мо' найбольш здольны з прадстаўнікоў „палёнофілаў“ выясьніў у апошнім нумары „Беларускага Дня“, што групам гэным ідзе не аб арганізацыю беларускіх сілаў дзеля здабыцьця незалежнасьці для Заходняе Беларусі, а—для Усходняе, якая знаходзіцца па-за межамі Польшчы. Прынамся палёнофільская газэта за галоўны „праступак“ Грамады абвяшчае тое, што яна, бароначы беларусаў пад Польшчай, не вяла барацьбы з радавай уладай у Менску! І гэта „палёнофілы“ лічаць... „здрадай незалежніцкага ідэалу“...

Як бачым, прадстаўнікі згодніцкае палітыкі ў адносінах да польскае буржуазіі пойдуць на выбарах адзіным фронтам, крывадушна напісаўшы на сваім сьцягу сьвятое для беларусаў слова „незалежнасьць. Але з другога боку трэба спадзявацца, што беларускія масы, якія за апошнія гады нязвычайна вырасьлі і дасьпелі палітычна, здолеюць ацаніць „незалежніцкую шчырасьць“ згодніцкіх групаў,—здолеюць зразумець, што народы здабываюць незалежнасьць ня ўгодай, а змаганьнем, ды што ў сучасных варунках справа беларускае незалежнасьці—гэта не задача дня, а *ідэал*, ня менш ад нас далёкі, чым ідэал польскае незалежнасьці ў 1831 ці 1863 гадох быў далёкі ад тагачасных барацьбітаў за яго. І ў сучаснай штодзеннай барацьбе за нашы элемэнтарныя правы ў польскім Сойме наіўна і сьмешна думаць, быццам праз гэны самы Сойм вядзе наш шлях да незалежнасьці...

Але ня будзем даўжэй затрымлівацца над гэтай справай. Адзначым толькі, што згодніцкія групы беларускага грамадзянства 25 сакавіка раскрылі свае выбарныя карты. Ці запраўды ім удасца нешта выіграць у масах гэтым спосабам, — вельмі сумляваемся!

Эндэцкая газэта „Газ. Варш. Поранна“ ў нумары з 8-га красавіка падае вестку з Вільні, быццам перад польскім урадам распачаты заходы, каб атрымаць дазвол прыехаць у Польшчу тым беларускім эмігрантам, якія „адзначыліся сваей папярэдняй проці дзяржаўнай дзеяльнасьцю“.

З увагі на тое, што пад „процідзяржаўнай дзеяльнасьцяй“ трэба разумець незалежніцкую работу,—з гэтае весткі, паскольку яна праўдзівая, вынікала-бы, што: або незалежнікі, якім абрыдла бадзяцца на эміграцыі, вырakліся сваіх незалежніцкіх імкненьняў, або ...незалежніцкая дзеяльнасьць перастала лічыцца ў Польшчы „процідзяржаўнай“.

Апошняга неяк дагэтуль ня відаць. Прынамся засуджаны ў катаргу за незалежніцкую дзеяльнасьць пасол Сяргей Баран усё яшчэ лічыцца пазбаўленым правоў і не дапускаецца да выпаўненьня пасольскіх абавязкаў, хаця і судзілі яго, і трымалі блізу чатыры гады ў вастрозе навет бяз згоды на гэта Сойму... Дык, відаць, больш правільным трэба лічыць дапушчэньне, што нашы эмігранты йдуць на кампраміс з сваімі перакананьнямі і сваім сумленьнем!..

Што-ж: людзі, як людзі....

Перадвыбарныя залёты да работнікаў.

У „Роботніку“ зьмешчана невялічкая, але цікаўная стацьця аднаго з найбольш сымпатычных і асабіста чыстых пэпээсаў, пасла Уземблы. Артыкул мае мэтай — разьбіць усе „легенды аб дабрадзейных скутках маёвага перавароту ў гаспадарчай галіне“. Бо на гэтай легендзе,—кажа аўтар — калыханцы для сумленьняў у польскім грамадзянстве, вырастаюць псыхалягічныя магчымасьці „апраўданьня найагіднейшых праяваў сучаснага палажэньня, створаных клясавым эгаізмам буржуазіі і руйнучых работніцкую клясу, а ўсяму грамадзянству пагражаючых— цяжкімі ўстрасеньнямі“...

Аўтар паўтарае тое, што беларуская прэса казала ўвесь час—ад самага „траўня“.— „Польская гаспадарчая (і сацыяльная) палітыка зусім не зьмянілася прынцыпова ў 1926 г“. Дасягнены дадатнія рэзультаты толькі ў галіне лічбаў. Але рэзультаты гэтыя дасягнены — коштам „такой вялікай крыўды працуючых масаў, што 1926 год для работніцкай клясы будзе ў яе гісторыі пэрыядам заняпаду Працы, трыумфам Капіталу—на карку працоўных“.

Аўтар кажа, што „маёвыя выпадкі“ вельмі ўдатна і шчасьліва,—на-жаль, толькі не для работніцкай клясы,—падыйшлі ў той мамэнт, калі работнікі ў сваей барацьбе з буржуазіяй, якая, маючы на чале мін. Зьдзеховэкага, пачала сваё наступленьне проці працоўных, былі блізкія да перамогі. Дзеля таго работніцкая кляса — пад кіраўніцтвам пэпээсаў — так рашуча кінулася памагаць „перавароту“, які, дзякуючы ей перадусім, перамог... „Але рэзультаты яго аказаліся такія, якія заўсёды прыносяць перавароты, дзе рашучую ролю іграюць адзінкі, але ня масы“... — Пачаліся персанальныя перамены на вышэйшых становішчах у дзяржаве, зьменена фармальна сыстэма ўрадаваньня, але зьмест (сацыяльны) астаўся стары. „Замест абяцанага тэрору проці ўсякае „няпраўды і бяспраўя“, былі мабілізаваны ўсе старыя арсэналы якраз на ўтрыманьне—старога гаспадарча-сацыяльнага ладу... Маёвы пераварот ня толькі ня прынёс нічога новага ў падставовае сацыяльна-гаспадарчае жыцьцё краю, ня толькі ўмацаваў у ім стары лад вызыску, але да ўсяго гэтага ён — „выпусьціўшы ў паветра энэргію масаў, стварыўшы нейкі выгляд „новых формаў“,— па сутнасьці ўмацаваў на даўгі час прынцыповую крыўду працоўных“... Дзеля таго, кажа аўтар, ня маюць запраўднай вартасьці ўсе дасягнутыя „эфэкты гаспадарчай палітыкі, як раўнавага бюджэту, стабілізацыя валюты і інш...

Трэба толькі адзначыць, што ўсё, у чым пэпээсаўскі орган вінаваціць урад, зроблена... пры самым чынным учасьці „абаронцаў“ работнікаў—пэпээсаў!

Практычны вывад.

У папярэднім нумары „Нашае Праўды“ грам. А. Н. — у стацьці „Знацыяналізаваная“ Каапэрацыя — даў сумны абраз развалу беларускае сялянскае каапэрацыі ў выніку паходу проці яе польскага нацыяналізму. Вось, мне і хочацца зрабіць з гэтага адзін вельмі просты і ясны **практычны вывад**.

Хіба-ж ніхто ня будзе спрачацца, што каапэрацыя мае вялізарнае значэньне ў грамадзкім жыцьці наагул, а ў нашым беларускім — асабліва. Патрэба **эканамічнае самапомачы** — гэта-ж просты вынік з таго палажэньня, у якім апынуліся беларускія працоўныя масы Заходняе Беларусі: тут уся эканамічная палітыка дзяржавы мае наўвеце перадусім інтарэсы пануючае нацыянальнасьці, а як да апошняе на нашай зямлі належаць бадай выключна клясы больш заможныя, дык на эканамічныя патрэбы і інтарэсы беларускае працоўнае масы ніхто асаблівае ўвагі не зварачае. І паход польскіх нацыяналістаў на нашу сялянскую каапэрацыю зусім ня лічыўся з вынікамі ягонае „перамогі“: якое дзела польскім нацыяналістам да таго, што адзіны спосаб сялянскае самапомачы — разьбіваецца?

Вось-жа, ня гледзячы на дачэсную перамогу нацыяналізму пануючае нацыі над каапэрацыяй у Заходняй Беларусі, павінны разумець, што ў каапэрацыі рашаючую **сілу** маюць ня тыя ці другія павадыры каапэратыўнае работы, а — **маса спажыўцоў**. Ясна, што ў нашай вёсцы вялізарная большасьць спажыўцоў — гэта беларускія сяляне. І ад іх, а не ад некага іншага, будзе залежаць кірунак і нацыянальная ахварбоўка каапэратыўнае працы. Але — пад адным варункам: калі ў каапэрацыю пойдзе **запраўды-ж маса**, калі ў нас будзе ня 33 каапэратывы, як сёньня на ўсю Віленшчыну, а **сотні іх**! Дый толькі тады яны будуць прадстаўляць вялізарную эканамічную сілу, пад той час, як — пры істнаваньні некалькіх дзесяткоў каапэратыўных таварыстваў — затрачаная на арганізацыю іх энэргія блізу дарма прападае!...

Беларускія працоўныя масы, як вясковыя, так і мястовыя, прывучаныя ўжо да супольнае грамадзкае працы, павінны гэтую сваю грамадзкую практыку выкарыстаць **на грунце тварэньня падставаў сваей народнай эканамічнай самапомачы**. І дзеля гэтага каапэратыўная праца павінна стацца на сяньняшні дзень лёзунгам для ўсіх сьвядомых нацыянальна і сацыяльна беларусаў. А калі створацца запраўды соткі каапэратываў, дык тады іх саюз будзе выяўляць **ужо аблічча беларускае вёскі**, будзе мець вялікую **фінансавую сілу**, будзе здольны скінуць апеку людзей, што прыбіліся да нас, як няпрошаныя апякуны нашыя...

Вось і ўвесь мой практычны вывад з **успомненае стацьці грам А. Н. Мы не павінны** абмежыцца сцьвярджэньнем сумнага факту „**знацыяналізаваньня**“ **нашае каапэрацыі пануючай нацыяй, а мусім паправіць тое зло**, якое факт гэны нам зрабіў, спыніўшы натуральны рост каапэрацыі ў Заходняй Беларусі.

Дык бярэцеся да працы, грамадзяне! **Будуйце сваю ўласную каапэрацыю — каапэрацыю працоўных места і вёскі, а дружны наш** высілак створыць нам магутнае арудзьдзе дзеля барацьбы за паляпшэньне нашага быту і вызваленьне ад вызыску розных дармаедаў!

Каапэратар.

Нядоля вуглякопаў.

Пад той час, як нясупынны рост дарагоўлі прымушае работнікаў усіх відаў прамысловасьці дамагацца забастоўкамі павялічэньня сваіх жабрацкіх заробкаў, уласьнікі капальняў вугальля, добра набіўшы свае кішані ў часе штрэйкбрэхерскае даставы вугальля ў Англію падчас тамтэйшае забастоўкі, хочуць панізіць заробкі сваіх работнікаў. Вось-жа ў адказ на дамаганьне вугальных прамыслоўцаў зьніжэньня платы работнікам пас. Станьчык дае ў „Роботніку“ цікаўныя лічбы, якія паказуюць, як страшэнна эксплёатуюць спажыўца і работніка гэтыя „вугальныя бароны“ ў Польшчы.

Польскія вугальныя капальні — ў Сілезіі дый у Дамброве (перадусім—першыя) — запраўды-ж, можа, лепшыя ў сьвеце.— Глыбіня шахтаў—невялікая,—ад 200 да 400 мэтраў, пад той час, як у Нямеччыне ды Англіі пласты вугальля пад зямлёй часта ляжаць на глыбіні 1000 мэтру. Грубіня вугальных пластоў у Польшчы даходзіць да 18 мэтраў; у Англіі і Нямеччыне эксплёатуюць вугальле навет на 1 мэтр грубіні. Гэта ўсё робіць значна таньнейшымі і будаваньне шахтаў і наагул эксплёатацыю вугальля.

Выдатнасьць працы польскага вуглякопа наагул на 10 прац. большая, чым у Англіі, і—аж на 20 прац. большая, чым у Нямеччыне. Так было перад вайной. Цяпер, дзеля розных прычынаў, выдатнасьць працы англійскага вуглякопа — на 30 прац. ніжэй, чым польскага.

Гэткім чынам — пры сярэдняй выдатнасьці працы польскага работніка 1200 кілаграмаў у дзень—сярэдні дзенны заработак яго—6 зл. 80 гр. У Нямеччыне—пры выдатнасьці 1,150 кілягр. — работнік атрымлівае 14 зл. 80 гр. у дзень. У Англіі — пры выдатнасьці 840 кілягр. — работнік мае 15 зл.

Ня гледзячы на гэта, цана вугальля ў Англіі, Нямеччыне і Польшчы—больш менш роўная, у Англіі—на 3 зл. даражэй на тоньне, (35—32 зл.). Але, калі паглядзець, якую частку гэтай цаны тонны вугальля прамысловец аддае работніку, дык пабачым нешта запраўды „цікаўнае“. — Англійскі работнік мае з гэтай цаны 52 прац., ці—больш як палову цаны; гэткім чынам, з кожнай тонны дабытага вугальля ён мае па 18 зл., а прамысловец, купец і інш., разам з усялякімі выдаткамі, маюц толькі 17 зл. У Нямеччыне работнік мае з прадажнай цаны вугальля 40 прац. для сябе, ці, інакш, з кожнай тонны, цаной 32 зл., — па 13 злот. **Польскаму работніку прамысловец пакідае з цаны вугальля толькі 19 прац., ці каля 6 злот з кожнай тонны, вартай 32 зл.** Датаго-ж яшчэ розныя выдаткі прамыслоўца на работніка ды дзяржаўныя падаткі ў Англіі і Нямеччыне значна большыя, чым у Польшчы. І вось — пры ўсіх гэтых варунках — польскія вугальныя бароны „маюць бясчэльнасьць дамагацца — далейшага зьніжэньня работніх заробку, павялічэньня дня працы, зьмяншэньня так званых „сацыяльных падаткаў“, — правакуючы яўна работнікаў на забастоўку...

Ясна-ж: цяпер вугальля ў Англію не павязеш, дык трэба зьменшыць выдайнасьць капальняў. Дык прамыслоўцы і рады, каб работнікі самі спынілі працу: менш клопату!

Але што будуць рабіць людзі, пазбаўленыя працы?

Палажэньне у Кітаі завастраецца.

Разгром радавага пасольства ў Пэкіне.

ПАТ падае тэлеграму з Пэкіна:

„На падставе паўнамоцтва, данага дыпляматычным корпусам (гэта значыць—усімі пасламі чужаземных дзяржаваў) — 100 жаўнераў Чанг-Тсо-Ліна ўварваліся 6 красавіка ў гмах радавага пасольства ў Пэкіне". У выніку гэтага нападу і выкліканай ім страляніны пасольства было занята жаўнерамі, радавы паўнамоцнік і яго ўрадоўцы зарыштаваны ў пасольстве; рэшта расейцаў і 20 кітайцаў, якія там былі, адведзены ў паліцыю. Гэтыя арышты, як чутно, выкліканы былі агітацыяй, якую вяло пасольства.

Так кажа тэлеграма. Найцікаўней у гэтым усім, што гэты напад жаўнераў на пасольства зроблены — „з даручэньня" ці „з упаважненьня" іншых пасольстваў... Здаецца, яшчэ гэткіх выпадкаў дыпляматычная гісторыя наагул ня ведала!

Абурэньне нямецкіх газэт.

Усе нямецкія газэты страшэнна ўсхваляваны з прычыны весткі аб тым, быццам „дыпляматычны корпус (гэта значыць: усе паслы чужаземных дзяржаваў) упаважніў" Чанг-Тсо-Ліна на разгром радавага пасольства ў Пэкіне і арышты калег-дыпляматаў, якія на ўсім цывілізаваным сьвеце лічацца нятыкальнымі.

Нямецкая прэса высказвае перакананьне, што нямецкі пасол ня прымаў удзелу ў гэткім варварстве.

Сацыялістычныя газэты пішуць, што гэта—„найвялікшы скандал у палітыцы эўрапэйцаў на Усходзе за ўсе часы". Бо гэта яўнае правакаваньне Радаў да ваеннай акцыі, якая можа выклікаць адкрытую вайну між СССР і эўрапэйскімі дзяржавамі.

Але-ж гэтага, відаць, якраз і трэба — ангельцам...

Рады рыхтуюцца да адказу на правакацыю.

Нямецкія ж газэты паведамляюць, што радавы ўрад пастанавіў даць добры адказ на правакацыю Чанг Тсо Ліна, адкрыта аружна выступіўшы проці яго — на падмогу наступленьню ген. Фэнга. Быццам радавыя войскі ўжо маюць канцэнтрычным паходам заняць Харбін. Быццам Масква ўжо аканчальна рашыла актыўна ўмяшацца ў вайну, ды чакае толькі на добры момэнт.

Трэба думаць, што гэтыя весткі—залішне пасьпешныя. Праўда, мо' толькі ў тым, што на граніцы Манчжурыі Рады трымаюць вельмі значныя сілы, дый усё павялічваюць іх.

СССР выступіць проці Чанга?

Польскія газэты інфармуюць, быццам радавы ўрад—у адказ на напад жаўнераў Чанг-Тсо-Ліна на радавае пасольства ў Пэкіне — маніцца пасласць сваю армію ў Манджурыю, даручыўшы ей заняць Харбін.

Новыя выступленьні проці бальшавікоў.

Пасьля разгрому радавага пасольства ў Пэкіне падобныя разгромы зроблены ў Цянь-Дзіне, і, як пішуць ангельскія крыніцы, навет у—Шанхаі, але—на тэрыторыі чужаземнай канцэсіі.

Генаральнае наступленьне.

Усе паўночныя генаралы — на нарадзе пад старшынствам Чанга — пастанавілі распачаць генаральнае наступленьне на ўсім фроньце проці кантонскай арміі. Абвешчана агульная мабілізацыя ўсіх кітайцаў ад 18 да 38 гадоў. Зачынены ўсе чыгункавыя шляхі для таварнага і пасажырскага руху, бо заняты перавозкай войскаў. Паўночная армія добра азброена коштам і пад кіраўніцтвам Японіі і Англіі, але яе павадыр страшэнна баіцца кантонцаў — ня столькі іх матэрыяльнай сілы, сколькі „агітацыі", ці прасьцей ідэйнага зьместу іх барацьбы, бо гэтая „зараза" для яго арміі вельмі небясьпечная.

Пасьпехі кантонцаў на поўдні Кітаю.

Дагэтуль—з усяго паўдзеннага Кітаю—не прызнавала ўлады Кантону адна толькі правінцыя Юнан. Але вось толькі што ў яе сталіцы выбухнула рэвалюцыя, у выніку якой губэрнатар яе арыштаваны, а новастворань ўрад прызнаў уладу Кантона.

Гэтая правінцыя граніччыць на поўдні ўжо з францускім Інда-Кітаем. Дык у Парыжу страшэнна занепакоены, што рэвалюцыйна незалежніцкі рух можа перакінуцца ў Індакітай.

Кантон пэўны пабеды.

Кантонская армія, пасоўваючыся шпарка ўпярод, рассыпае перад сабой масу агітацыйных адозваў. У гэтых адозвах, паміж іншым, кажа, што не далей, як за 8 тыдняў, **Пэкін будзе ўзяты.**

Паўночныя арміі пробуюць даць адпор.

Ангельскія крыніцы паведамляюць, быццам наступаючыя на Пэкін кантонскія арміі спатыкаюць усё мацнейшае спраціўленьне з боку паўночнай арміі Чанг-Тсо-Ліна. Гэта выклікала падсылку сільных падкрапленьняў кантонскім камандаваньнем.

Усе чужаземцы пакідаюць Кітай.

Японскі ўрад запрапанаваў усім японскім грамадзянам, каб яны выехалі з усяго Сярэдняга Кітаю ў Ханькоў, скуль іх забяруць японскія караблі. Ангельскі і амэрыканскі ўрады загадалі ўсім сваім грамадзянам выехаць з усяго Паўночнага Кітаю — уключна з Пэкінам. Пачаўся гэткім чынам масавы выезд чужаземцаў з Кітаю.

Адстаўка галоўнага камандзіра кантонскай арміі.

Пасьля ведамай заявы галоўнага камандзіра Чанг Кай-Шэка, у якой кантонскі ўрад угледзіў перадчасныя захады і нахіл да паразуменьня з імпэрыялістычнымі дзяржавамі, а таксама шэльмаваньне перадусім сьветам лявіцы Куо-Мін-Танга, — усё магутнеючая сваімі ўплывамі на ўрад радыкальная лявіца дабілася адсгаўкі Чанг-Кай-Шэка.

Чанг-Тсо Лін баіцца здрады!

У Пэкіне страшэнна ўстрывожылі ўсіх чуткі аб тым, быццам некаторыя камандзіры асобных часьцей паўночнай арміі рыхтуюцца да здрады, вядучы ўжо цяпер тайныя перагаворы з Кантонам.

Нямеччына шле аружжа ў Кітай.

У нямецкім парляманьце паслы выступілі з інтэрпэляцыяй у справе масавага вывазу аружжа ў Кітай. Штрэзэман адказаў, што ўрад нічога аб гэтым ня ведае...

Яшчэ англійская падмога ў Кітай.

Англійскі ўрад паслаў у Кітай яшчэ адну пяхотную брыгаду — з гвардыйскім батальёнам і з дывізіёнамі танкаў, бранявікоў і цяжкай артылерыі. Гэткім чынам англійскіх войскаў у Кітаі пад Шанхаем ужо 22 тысячы.

Магчымасьць англійска-японскага саюзу.

У Маскве перакананы, што англійская дыпляматыя стараецца з усіх сілаў нахіліць Японію да ўзнаўленьня саюзу з Англіяй, які калісьці даў такую вялізарную карысьць Японіі — у вайне з Расеяй. Японія быццам мае рашыцца на гэты крок, калі ўбачыць, што левае крыло кітайскіх нацыяналістаў аканчальна перамагло ўмераных.

За 20 мінут бамбардаваньня забіты ў Нанкіне толькі—тры кітайцы...

Чэмбэрлен, кажучы ў парляманьце аб кітайскіх справах, паміж іншым заявіў, быццам у часе 20-мінутнага бамбардаваньня Нанкіна англійцамі з цяжкіх гарматаў флёту забіты ўсяго толькі... 3 кітайцы! Праўда, ён дадаў, што гэта тры цывілі, а сколькі забіта „жаўнераў кітайскіх, гэтага сцьвярдзіць немагчыма"... А самае места Нанкін, быццам зруйнаванае бамбардаваньнем, як „лгуць бальшавікі",—дык ня толькі зусім не пацярпела, але—наадварот: толькі зрабілася пякнейшым... Пэўна-ж англійскія артылерысты стралялі шакаладнымі бомбамі!

Той жа Чэмбэрлен сцьвярдзіў, што чужаземцаў у Нанкіне забіта кітайцамі (няведама толькі, якімі) 7 асоб.

Палітычная хроніка.

У Польшчы.

„Камітэт экспэртаў".

Пасьля доўгага перарыву ізноў дае азнакі жыцьця так-званы „Камітэт знаўцаў меншасьцёвых спраў", былая „крэсавая сэкцыя", створаная калісьці Ст. Грабскім. 4 красавіка адбылося паседжаньне гэтага Камітэту ў складзе: пэпэсаўца Васілеўскага і былага пэпэсаўца Левэнгэрца. Як ведама, трэці „знаўца" п. Голувко, так сама пэпэсавец, атрымаў добрую пасаду — ў дыпляматычнай бюракратыі, дык з складу камітэту выйшаў. Аб чым жа „сядзелі" гэтыя паны „знаўцы"?—Аб тым, ці дазволіць жыдоўскім крамам таргаваць у хрысьціянскія сьвяты і перад сьвятамі!—Але, пасядзеўшы цэлы вечар, ня вырашылі гэтага пытаньня, дык — адлажылі на другое паседжаньне.

Новая часопісь да спраў нац. меншасьцяў.

Выйшаў першы нумар новай польскай часопісі, ахвяраванай справам нацыянальных меншасьцяў у Польшчы. Няма сумліву, што новае выданьне выклікана паяўленьнем на сьвет часопісі „новай 16" — „Нацыі". Рэдакцыя абяцуе зусім аб'ектыўна і навукова разглядаць пытаньні, зьвязаныя з жыцьцём польскіх меншасьцяў. Пакуль ня маем у руках часопісі, ня можам ацаніць гэтай аб'ектыўнасьці.

Паміж іншымі артыкуламі беларускім справам ахвяраны два: ведамага беларусам былага віленскага публіцыста п. Сьвяхоўскага—„Сучасны стан беларускага школьніцтва на ўсходніх землях", і бязыменнага аўтара—„Нацыянальная палітыка ў Радавай Беларусі".

Урад рыхтуе два прэсавыя дэкрэты.

„Кур. Поран" даведаўся, што ўрад гатуе аж 2 новыя прэсавыя дэкрэты, якія мелі ўжо быццам разглядацца 6 красавіка Радай Міністраў.

Ведама, што пасьля скасаваньня першага дэкрэту Соймам, урад сьпёк другі, як падаваў у сваім часе той-ж „Кур. Поран",—мала чым лепшы за першы. Абодва дэкрэты ўзбурылі ўсё польскае і няпольскае грамадзянства, апрача толькі казённых пісакаў, якім, ведама-ж, усялякія скарпіёны для незалежнай прэсы робяць лягчэйшым іх лякайскі абавязак хваліць заўсёды ўрад.

Другі дэкрэт мін. Мэйштовіч ужо даў на прагляд арганізацыям польскіх журналістаў, дый пасьля іх крытыкі зрабіў у праекце пэўныя зьмены. Але зьмены гэтыя, як сцьвярджае „К. П.", вельмі нязначныя. Пасьля праекты пайшлі ў „Праўнічую Раду", якая так сама—„выдала апінію".

Гэткім чынам, ўсё-ж трэба, як піша „Кур. Пор.", — спадзявацца ў дэкрэтах, калі яны выйдуць у сьвет,—балючага „бату" для прэсы...

„Мілітарызацыя адміністрацыі".

Пад такім загалоўкам „Дзен. Віл." піша: „Пасьля маёра Горскага, які быў назначаны ў Прэзыдыум Рады Міністраў, апошнім распараджэньнем Ваеннага Міністэрства назначаны ў Міністэрства Унутр. Спраў: маёр Рутkоўскі, які ў сваім часе быў ў бэльвэдэрскай роце пры Начальніку Дзяржавы, і маёр Дзядош.—Як лучнік між мін. Прам. і Гандлю і Ваенным назначаны маёр Пікуса".

Клерыкальны скандал у Польшчы.

Нядаўна галава Каталіцкага Касьцёлу ў Польшчы кардынал Каковскі зьвярнуўся да ўсяго каталіцкага насяленьня Польшчы—з заклікам да рашучага байкоту так-званай „І. М. С. А.", гэта значыць: „Хрысьціянскага Саюзу Моладзі", перакінутага ў Польшчу такой-жа амэрыканскай арганізацыяй. Кардынал Каковскі, пазываючыся на „патапляючы" гэтую арганізацыю, як „масонскую" і „бескасьцельную", — ліст самога Папы, не шкадаваў слоў, каб паказаць небясьпеку, якую нясе польскай моладзі гэтая амэрыканска-масонская зараза. Ліст рашуча забараняе даваць ахвяры Камітэту гэтай арганізацыі.

А вось, цяпер „Роботнік" раскрывае, якім палітычным скандалам зьяўляецца гэты „пастэрскі ліст" кардынала Каковскага.

Аказываецца, што на чале гэтага Камітэту для збору ахвяраў, як яго пратэктарка, стаіць... жонка п. Прэзыдэнта Рэспублікі; „ганаровым сябрам" Камітэту зьяўляецца... прэм'ер марш. Пілсудскі; апрача яго, такімі-ж пачэснымі сябрамі зьяўляюцца: мін. замежных спраў Залескі, ды цэлы рад іншых высокіх асоб Польшчы...

Як піша, „Роботнік", гэтым скандалам мае заняцца Рада Міністраў.

Найцікаўней выглядае ўся гэтая справа па сутнасьці: гэная арганізацыя моладзі рабіла ў часе вайны і робіць усьцяж цяпер шмат добрага: памагае бедным, галодным, бяздомным, хворым,— як, здавалася-б, наказывае Той, чыім „намесьнікам" называе сябе Папа!

Радавыя работнікі памагаюць польскім.

„Правда" даносіць, што саюз радавых ткачоў пераслаў — з сумаў міжнароднага забастовачнага фонту — 10 тысяч рублёў на падтрыманьне баставаўшых польскіх прадзільна-ткацкіх работнікаў.

Абураюцца...

Польская прэса страшэнна абураецца на радавы ўрад за—„бяспрыкладны прысуд над польскай грамадзянкай". Справа ў тым, што „маскоўскі акружны суд засудзіў польскую грамадзянку Астроўскую на 8 гадоў катаргі—за тое, што яна быццам займалася шпіёнствам. „Известия" тлумачаць прысуд тым, што падсудная мела нейкую сувязь з польскімі консульствамі, асабліва—з Ленінградзкім і Менскім. Так паведамляе польскае „Ўсходняе Агенцтва".

Польская прэса лічыць гэты арышт і прысуд —„бяспрыкладнымі". Праўду кажучы, добра пашукаўшы, можа-б прыклады і знайшліся.

Арышт ведамага польскага камуніста.

Лодзкая паліцыя арыштавала аднаго з павадыроў камуністычнага руху ў Польшчы—Ціхоўскага, які быў камісарам літоўска-беларускага ўраду ў Вільні ў 1919 г. Ціхоўскі быў арыштаваны на вуліцы, апрагуты ў жыдоўскім лапсардаку з прыклеенай барадой. Від гэткага „жыда" паказаўся падазроным паліцэйскім агентам, адзін з якіх папрасіў яго да камісарыяту, дзе і выясьнілася асоба затрыманага.

З нядаўнае мінуўшчыны.

(*Фэльетон*).

> „Прамыслоўцы Дамброўскага вугальнага райёну заявілі работнікам, што ня будуць плаціць падвышкі ад 1-га сьнежня. Саюз вуглякопаў трэбуе падвышкі. У выпадку апору прамыслоўцаў у райёне мае быць абвешчана забастоўка". З газэт.

Дрогі Антэк!

Яшчэ раз на раны Хрыстуса малю цябе ратуй нас ад голаду прышлі хоць троху грошы... Працую я толькі тры дні ў тыдзень а плацяць нам блага. Работы іншай ніякай нямашака ўсе вуглякопныя долы стаяць пся іх крэў гаспадары кажуць, што няма куды вугальля дзяваць мы тут сабраўшыся злажылі навет дваццаць злотых і паслалі на ахвяру да маткі боскай Чэнстахоўскай а праца ў капальнях не пачынаецца. І прашу цябе на раны пана Езуса гідэльскага ратуй нас. Ад вернай сьмерці прышлі нам хоць злотых дзесяць на хлеб, каб нам ня прыйшлося ісьці тапіцца або вешацца. Цалуем цябе ўсе твой брат Вацэк.

Дамброва Гурніча
1-га траўня 1926 г.

Адрывак пераводу.

Пасылаю табе восем злотых больш пасляць ніяк не магу бо і сам чуць кратаюся зарабляю прыпадковай работай сталай ніякай нямаю. У нас у Варшаве ўсё неспакойна ўсе кажуць што будзе перамена Антэк.

На адвароце пячатка
пошты: Варшава 7./V. 1962 г.

Дрогі Антэк!

Дзякую за прысланыя восем злотых і варочаю іх табе назад пераводам. У нас цяпер як там у вас у Варшаве дзядэк зрабіў добрае ляне ўсей Вітасаўскай галоце пачалося ня жыцьцё а праўдзівы рай работы ёсьць колькі хочаш плацяць праўда слабавата ды Што ж ты зробіш дзякуй богу Што хоць работа Ёсьць а вось як пачалі мы што дня хадзіць на работу то да нас прыехаў якісьці агітатар і казаў нам каб мы на работу ня пісаліся і не хадзілі бо гэтым толькі сабе пашкодзім, а гэта мела быць таму што капальні нашы пачынаюць працаваць таму што ангельскія вуглякопы забаставалі і дамагаюцца ад сваіх гаспадароў Большай платы. чытаў гэты агітатар нам і пісьмо ад ангельскіх вуглякопаў яны просяць вуглякопаў усіх краёў памагчы ім і не дабываць вугальля якое-б мела быць прадана ў Англію ды што калі яны ангельскія вуглякопы перамогуць то і нам будзе лепш бо і на ўсім сьвеце вуглякопам будуць плаціць даражэй а Нам ксёндз пробашч казаў што гэты агітатар бальшавік і гавора так каб Нашкодзіць польшчы а наш дырэктар казаў што калі мы цяпер будзем працаваць і не перашкодзім вывозіць наша польскае вугальлё заграніцу тады злот наш польскі пойдзе ўгору і нам будзе ўсё дзешавей дык мы гэнага агітатара бальшавіка пся яго крэў не паслухалі І наш зьвёнзак[1]) казаў таксама яго ня слухаць якое нам дзела да ангельскіх работнікаў і да таго ці яны перамогуць ці не а калі ты браце Антэк там жывеш у варшаве Блага і работы ня маеш дык прыяжджай да нас гаспадар капальні шукае новых вуглякопаў то і цябе на работу возьме а плацяць нам цяпер акуратна а ўсе залегласьці нам ужо таксама сплацілі кланяемся табе ўсе і ўсе цябе цалуем Вацэк.

Домброва Гурніча
1-га чэрвеня 1926 г.

[1]) Саюз.

Poland *Expres*

Дырэктару Таварыства
Польвэнгль
Варшава

Ніколі ня думаў я, што вы палякі такі здольны народ. Але цяпер мушу сцьвердзіць, што вы малайцы і працоўным быдлам кіраваць умееце ня толькі лепш, чым хтось іншы на сьвеце, але можа лепш навет за нас, ангельцаў. Калі транспарты з вашым вугальлём і далей будуць у такім ліку і так акуратна прыхадзіць к нам у Лёндан, то нашы вуглякопы могуць баставаць, колькі ім хочацца; доўга без работы яны ня вытрываюць — голад і холад скора скруце іх у тры пагібелі—пойдуць працаваць, аж люба будзе глядзець.

Дык-жа глядзіце не падкачайце, — бо апрача, як у вас, мы вугальля нідзе ня можам дастаць,—не дае гэтае паршывае рабочае быдла. Калі споўніце гэта акуратна, то можаце спадзявацца, што заўсёды ў Польшчы фашызм мы вам заўсёды ахвотна паможам.

Джэк Більль
Дырэктар злучаных ангельскіх банкаў.

Лёндан
16./VI 1926 г.

Дрогі Антэк!

На раны пана езуса гідэльскага Прашу цябе падашлі мне хоць троху грошы бо мы цяпер бастуем і на работу ня ходзім а пастанавілі мы баставаць бо нам гаспадары плацяць надта мала а надварэ зіма і ўсё дорага і хлеб ужо ў два разы даражэй як быў летам, а гаспадары Упіраюцца а мы бастуем і што з гэтага будзе ня ведаем а наш зьвёнзак прасіў помачы ў вуглякопаў ангельскіх а тыя адказалі нам што яны нам памачы ня могуць што і мы ім як яны бастаалі не памагалі а толькі прашкаджалі і наагул нам ніхто памагчы ня хоча. Цалую цябе і прашу памажы нам і прышлі хоць сколькі помачы твой брат Вацэк.

Дамброва Гурніча
дня 18./XII. 1926 г.

Па тэлефону

Галё!... хто гаворыць?.. А, пан дырэктар... Дзень добры, дзень добры... Што? Кажаце, хочуць надбаўкі і грозяць забастоўкай... Ня думаў я, што ў нас дырэктар такі асёл... Ды плюньце вы і пашліце іх к чорту — калі хочуць, то хай працуюць, а калі не, то могуць ня толькі баставаць, а і зусім на работу ня прыходзіць: менш будзем прынамся мець клопату, бо трэба было спыняць працу і так. У Англію-ж цяпер вугальля не павязеш, бо там ужо свае вуглякопы працуюць.

В. Грывіч.

Трывожнае палажэньне у Румыніі.

Магчымасьць дынастычных забурэньняў у Румыніі.

З прычыны сьмяротнай хваробы румынскага караля ў Румыніі ізноў пачаліся хваляваньні; асабліва ўстрывожаны прыдворныя кіраўнічыя кругі. Справа ў тым, што ў Румыніі неяк не ўрэгулявана пытаньне аб наступніку трону. Старшы сын караля Кароль выехаў з краю, ажаніўся з „некаранаванай асобай“ і за гэта выкляты бацькай і пазбаўлены правоў на трон. Але народ у значнай частцы неяк „любіць“ гэтага „блуднага сына“, ці папросту ён—таксама, як і бацька, — мае сваю партыю палітычных афэрыстаў, якія спрытна рэклямуюць „манархічныя пачуцьці народу“, выкарыстываючы іх дзеля сваіх уласных мэтаў. Гэткім чынам, сьмерць караля Фэрдынанда можа выклікаць паважныя забурэньні, — тым больш, што жонка караля матка Караля— неяк прыхільна да апошняга. Дык, каб папярэдзіць магчымасьць забурэньняў, а можа — і хатняй вайны, абодва найспрытнейшыя ды найбольш уплывовыя палітыкі Румыніі—павадыры галоўных канкуруючых між сабой партыяў, — былы прэм. Братыяну і сучасны прэм. ген. Авэрэску, якім абодвум добра-б дасталася ад Караля, калі-б той стаўся каралём,—зрабілі між сабой саюз, каб за ўсялякую цану не дапусьціць да захвату трону Каролям, дый выбуху хатняй вайны. Ген. Авэрэску сьперша хацеў, каб „пільнавала трон“ у часе нялетнасьці законнага наступніка трону (другога сына караля)—каралева Марыя, але Братыяну, баючыся яе сымпатыі да Кароля, рашуча паўстаў проці гэтага. Гэткім чынам, на доўгі час мае кіраваць дзяржавай некалькі „рэгентаў“—выдатнейшых прыдворных ды палітыканаў. Ці станецца ўсё так, як яны расплянавалі, калі памрэ кароль, — яшчэ вялікае пытаньне. У кожным разе Румыніі пагражаюць вялікія ўстрэсеньні, якія, пачаўшыся з дынастычных спрэчак, будуць значна паглыблены ды пашыраны—сацыяльным і нацыянальна-аддзяленчым рухам, што выклікаюцца гвалтамі баярска-фашыстаўскага румынскага ўраду ды стрымліваюцца толькі ваенна-паліцэйскім тэрорам.

Падрыхтоўка дыктатуры.

У Румыніі яўна рыхтуюцца да фашыстаўскага перавароту — у сувязі з спадзяванай у кожную часіну сьмерці караля. Дыктатуру мае захапіць сучасны прэм'ер ген. Авэрэску. Ен ужо сабраў у сталіцу некалькі брыгадаў адданай яму кавалерыі, а „няпэўныя“ ваенныя часьці пераведзены ў правінцыю. Усім сваім прыяцелям фактычны дыктатар ужо параздаваў усе важнейшыя становішчы ў дзяржаве. Абвяшчэньне дыктатуры афіцыяльна адбудзецца — у мамэнт сьмерці караля, — каб перашкодзіць усялякай акцыі на карысьць каралевіча Кароля і „хатняй вайны“.

Гэткім чынам, гэта будзе ўжо — шостая фашыстаўская дыктатура, істнуючая ў Эўропе. Не дарма ж пасьпяшылі з саюзам з Італіяй!..

Паводле белградзкіх вестак, гэтымі днямі меў прыехаць у румынскую сталіцу сын караля Кароль. Ці пасадзіць яго ў вастрог ген. Авэрэску, ці наадварот — ён пасадзіць дыктатара, гэта яшчэ пытаньне.

„Глос Правды“ піша, што Ціхоўскі — ў часе бальшавіцкага наезду на Польшчу ў 1920 г.— кіраваў усей палітычнай акцыяй у занятай бальшавікамі часьці Польшчы, маючы заняць мейсца прэм'ера камуністычнага ўраду яе. Пасьля адбіцьця бальшавікоў Ціхоўскі астаўся ў Польшчы, дзе—пад рознымі прозьвішчамі—кіраваў камуністычнай акцыяй, арганізуючы, паміж іншым, камуністычныя ачэйкі ў Лодзкім фабрычным раёне.

Працэсы за „маёвы пераварот“.

„Роботнік“ піша аб вельмі характэрных працэсах, у якіх польскія пракуроры цягнуць, а суды — судзяць ды засуджываюць польскіх сялян „за маёвыя выпаткі“. Нядаўна засудзілі 22 сялян; цяпер ізноў — 5. Дый засуджываюць не на жарты, але—аж на паўтара году турмы... А трэці такі-ж працэс яшчэ мае адбыцца 21 красавіка, дый можа гэта й не апошні...

Заграніцай.

Вынікі француска-радавых перагавораў.

З Масквы даносяць нямецкаму агенцтву, што перагаворы ў Парыжу — ў справе расейскіх даўгоў — далі пажаданыя вынікі. СССР прызнаў даўгі царскай Расеі ў разьмеры 450 міл. франкаў золатам. З свайго боку Францыя дае Радам зараз-жа доўгатэрміновую пазыку таварамі на 350 мільён. франкаў золатам. Апрача таго, Рады атрымліваюць расейскі флёт, што ад часу вайны стаяў у Бізэрце, затрыманы Францыяй.

„Разбраяюцца“...

Прэзыдэнт французкай Рэспублікі падпісаў дэкрэт, паводле якога ўрад мае да паловы 1928 г. скончыць будаваньне другой паловы ваенных караблёў, прадбачаных у праграме марскіх зброеньняў Францыі. Гэткім чынам, праз год гэта праграма мае быць скончана.

Італьянскія ўплывы на Балканах.

Пасьля падпісаньня трактату з Вэнгрыяй Мусоліні мае ў хуткім часе падпісаць такія-ж трактаты з Грэцыяй і Баўгарыяй. Калі гэта зробіцца, тады Югаславія будзе з усіх бакоў акружана італьянскімі саюзьнікамі.

Радавыя прапазіцыі Югаславіі.

Радавы ўрад даў паўнамоцтвы свайму прадстаўніку пры аўстрыяцкім урадзе на вядзеньне перагавораў з Югаславіяй — у справе ўзнаўленьня нармальных дыпляматычных зносінаў. Радавы ўрад гатовы зрабіць Югаславіі рад важных палітычных і гаспадарчых уступак. Апрача таго, СССР прапануе Югаславіі падтрыманьне ў яе абароне ад Італіі.

Ламаньне права забастоўкі ў Англіі.

Англійская прэса падала апрацаваны рэакцыйным англійскім урадам нячуваны ў Англіі праект закону аб зламаньні забясьпечанага канстытуцыяй права работнікаў на застоўку.

Арт. I праекту лічыць незаконнай кожную забастоўку, калі яна мае шырэйшыя мэты, чым эканамічныя дамаганьні работнікаў данай галіны прамысловасьці. Гэткім чынам усялякія „забастоўкі спагаду“ — дзеля падтрыманьня бастуючых таварышоў іншай галіны прамысловасьці, усялякія забастоўкі з палітычнымі мэтамі—дзеля націску на ўрад, забастоўкі, якія „крыўдзяць інтарэсы грамадзянства, ці — значнай яго часткі“ (напрыклад,—прамыслоўцаў) праект абвяшчае незаконнымі, а за ўчасьце ў іх абяцае кары—да 2 гадоў вастрогу. Асабліва цынічна тут гэтая „значная частка грамадзянства“: кожная забастоўка, пэўна-ж, крыўдзіць інтарэсы тэй ці іншай „часткі грамадзянства“—працадаўцаў, бо-ж бароніць інтарэсы другой часткі грамадзянства—эксплёатаваных працадаўцамі работнікаў. Гэткім чынам праект дае магчымасьць уладзе душыць кожную забастоўку. Гэта ўжо—фашызм.

Другі артыкул бароніць ды запэўняе паліцэйскую ахову — штрэйкбрэхерам (што ламаюць забастоўку). Трэці фактычна спыняе магчымасьць усялякай барацьбы з гэтымі „ламі-страйкамі“ і — працу па арганізацыі забастовак. Арт. 4-ты фактычна забівае палітычныя арганізацыі работнікаў, забараняючы ім прымусовы спагон складак. 5-ты арт. забараняе дзяржаўным урадоўцам прымаць учасьце ў прафэс. арганізацыях, і г. д.

„Партыя Працы“ заявіла, што будзе да апошніх сіл бароніцца проці гэтага фашыстаўскага закону, праектаванага англійскай буржуазіяй.

Новая змова проці Прыма дэ Рывэры.

У Барцэлёне ізноў выкрыта змова проці дыктатара Гішпаніі ген. Прыма дэ Рывэры. Арыштаваны некалькі афіцэраў.

Што ў Літве, тое-ж і ў Румыніі.

У Румыніі, таксама, як у Літве, распачалося з пагрому проці „камунізму“, якім „хрысьцяць“ там, як і дзе інш., усялякую самаабарону меншасьцяў, — а скончылася на тэроры проці сацыялістаў.

Апошні саюз Румыніі з Італіяй, ведама-ж, паддаў жару, адвагі і апэтыту румынскім фашыстам. Як заўсёды, першай ахвярай гэтага апэтыту зьявіліся сацыялісты „меншасьці“ — украінцы. Ужо шмат з іх павадыроў сядзіць у турме; сярод іх ёсьць кандыдаты ў парлямант. Закід усюды адзін: „здрада стану“, „атмасфэра шпегоўска“. А фактычна ўсе „праступленьні“ — у тым, што ўкраінскія сацыялісты выдавалі радыкальныя газэты ў сваей мове, зьбіралі подпісы на родныя школы і г. д. Рэчы добра ведамыя і нам усім. Арыштаваныя распачалі галадоўку пратэсту.

Падпісаньне трактату прыязьні паміж Італіяй і Вэнгрыяй.

5-га красавіка ў Рыме падпісаны трактат прыязьні між Італіяй і Вэнгрыяй—разам з рознымі дадаткамі: аб карыстаньні Вэнгрыяй з італьянскага порту Фіумэ—і інш.

Вайна ў гішпанскім Марокко разгараецца ўзноў.

Ня гледзячы на запэўненьні гішпанскага ўраду, яго войскі ніяк ня могуць справіцца з распачаўшымся ізноў паўстанчым рухам у Марокко. Спалохаліся ізноў і суседзі-французы, якія ўздоўж сваей граніцы ў Марокко значна ўзмацавалі ваенную ахову.

Амэрыканская пазыка для Польшчы.

Апошнія весткі ў справе пазыкі.

З Варшавы паведамляюць, што ўрад ужо дагаварыўся з паўнамоцнікам амэрыканскіх банкіраў п. Моннэ, у справе амэрыканскай пазыкі для Польшчы.

П. Моннэ быццам згадзіўся, каб тыя, хто будуць кантраляваць ужыцьце пазыкі, называліся—не „кантралёрамі“, але—„обсэрватарамі“. Пазыка мае складацца ўсяго з 80 мільён. даляраў, але давацца будзе не адразу, а часткамі—па 20 мільёнаў. Першая частка мае пайсьці выключна на падтрыманьне валюты. Далейшыя ўжо—на гаспадарчыя выдаткі.

Амэрыканскі публіцыст — аб пазыцы для Польшчы.

У паважнай нью-іоркскай газэце ведамы яе карэспандэнт, які быў месяц у Варшаве, піша у справе пазыкі для Польшчы цікаўныя рэчы.

Ён кажа, што сам п. Млынарскі адкрыта казаў яму, што англійскія банкіры вельмі хацелі даць Польшчы пазыку, але ставілі першым варункам, каб польскі ўрад прыняў у Варшаву—паўнаўладнага англійскага кантралёра, пад наглядам якога знаходзілася-б уся фінансава-гаспадарчая дзеяльнасьць ураду, ды які меў-бы бязумоўнае „права забароны“—адносна да ўсіх выдаткаў ураду. „Адным словам, англіцы хацелі-б мець у сваей руцэ фінансавую дыктатуру ў Польшчы—падобную да тэй, якую мае Ліга Народаў у Аўстрыі“. І вось, цікаўна: польскія прамыслоўцы ня толькі згаджаліся на гэта, але — навет з радасьцяй, бачучы ў гэткай уладзе заграірічнага камандзіра адзіны ратунак для Польшчы — ад развалу дый ад надужыцьцяў яе ўрадоўцаў... Але польскі ўрад адкінуў гэтыя дамаганьні.

Гэткім чынам і сарваліся перагаворы аб пазыцы—з англійцамі. Але, як кажа карэспандэнт, той-жа асноўны варунак стаўляе для пазыкі і Амэрыка. І тут ізноў—„гаспадарчыя колы“ ў Польшчы хочуць паддацца гэтаму кантролю, але ўрад (Пілсудскі)—ўпіраецца...

Той жа п. Фішэр піша аб тых скаргах, якія ён чуў у Варшаве на — „благія і несправядлівыя адносіны польскага ўраду да нацыянальных меншасьцяў“. Але найбольш цікаўна тое, што гэты амэрыканскі публіцыст піша аб ваенным бюджэце Польшчы.— Быццам яму найбольш паінфармаваныя паслы Польскага Сойму ды аж тры чужаземныя паслы ў Варшаве казалі, што „Польшча ўзапраўнасьці выдае на ваенныя мэты — да 45 прац. свайго бюджэту“. Прычына гэткіх выдаткаў ляжыць—„ці то ў псіхозе страху“ перад Нямеччынай і СССР, ці—наадварот — „у імкненьні да пашырэньня граніцаў Польшчы“...

З надбалтыцкіх рэспублік.

У апошнія часы ўвага ўсяе Эўропы зварачаецца на ўзьбярэжжа Балтыцкага мора, дзе розныя дзяржавы вядуць канкурэнцыю між сабой, стараючыся ўзяць пад свае ўплывы створаныя тутака дробныя рэспублікі — Літоўскую, Латвійскую і Эстонскую. Дык мы і выдзяляем весткі з-над Балтыкі ў асобны аддзел, каб лепш разглядзецца ў тамтэйшых адносінах.

Характэрна для гэтых адносінаў, паміж іншым, тое, што літоўскія фашысты, захапіўшы ўладу ў Літве ў свае рукі з дапамогай Англіі, шукаюць паразуменьня не з саюзьніцай Англіі — Польшчай, а — з Латвіяй і Эстоніяй. Цікаўна, каго яны ашукаваюць: ці сваіх „дабрадзеяў“, ці — суседзяў латышоў і эстаў?!...

Характэрна і тое, што, фліртуючы з Нямеччынай і СССР, літоўскія фашысты завялі нячуваны тэрор ў адносінах як да сваіх камуністаў, так і да ўсіх работніцкіх партыяў наагул.

Патройны балтыцкі саюз.

Літоўскі прэм. Вальдэмарас заявіў, што ў хуткім часе мае быць заключаны саюз між Літвой, Латвіяй і Эстоніяй. Падставай гэтага саюзу павінны быць добрыя адносіны яго сяброў да СССР і Нямеччыны.

„Нямецкі дадатак“ да „польскага інтэрв'ю“.

Мы зьмясьцілі ў апошнім нумары цікаўную гутарку латвійскага міністра замежных спраў Цэленса з польскім журналістам— у справе гаранцыйнага трактату з Радамі і праекту „Усходняга Лёкарно“ — бяз Польшчы. Як выяўляецца, так-званая „гутарка з

З выдавецкае нівы.

Мне прынесьлі надовячы жменю апошніх беларускіх выданьняў-кніжачак.

„Дзіцячы сьпеўнік“ Антона Грыневіча; пяць п'есак: Янкі Башкіра—„Гуртом“, камэдыя ў 1 дзеі із сучаснага жыцьця, Янкі Купалы—„Паўлінка“, сцэны з шляхоцкага жыцьця ў 2-х актах, выд. другое, Ул. Галубка — „Суд“, п'еса ў 1 акце, А. Гаротнага — „Два жаніхі“ і „Лекары і Лекі“, кам. ў 1 дзеі; далей Якуба Коласа „Выбраныя творы“ (угодкавае выданьне), яго ж „Казкі жыцьця“, Ст. Грынкевіча „Арлянё“, Мацея Бурачка „Дудка беларуская“, І. Дварчаніна—„Літэратурная Хрыстаматыя“, вып. І, — Альбэрта Паўловіча — „Снапок“, зборнік вершаў, выд. 3-яе, Аляксандры Смоліч — „Зорка“, першая навука чытаньня і пісаньня для беларускіх дзетак, выд. 11-ае; Л. Гарэцкай—„Родны Край“, кн. II, III і IV; А. Більдзюкевіча „Асновы грамадзкае гаспадаркі; „Паводле Іоана Сьв. Эвангельле“; урэшце—дзьве кніжачкі, пасьвячоныя каапэрацыі: „У Каапэрацыі будучыня!“ (адбітка з Беларускага Календара на 1927 год — выд. Бел. Выд. Т-ва) і М. Р. — „Палажэньне спажыўца“.

Як на пачатак году, дый у мамэнт разгрому арганізаванага грамадзкага жыцьця Заходняе Беларусі, — не благі плён. Дый гэта йшчэ, здаецца, ня ўсё, што выйшла сёлета з друку. А да таго-ж трэ' дадаць, што рухавае Беларускае Выдавецкае Таварыства, якое істнуе ўжо ад 1913 году, гатуе да друку дзьве бібліатэчкі перакладаў: для моладзі і агульную. Да першае прыгатаваны або перакладаюцца: „Робінзон Крузо“, дзьве „Кнігі Джунгляў“ Кіплінга, „Сэрца“ Амічыса, „Хата Дзядзькі Тома“—Бічэр Стоў, „Бабулька“—Нямцовай (з чэскага), „Прыгоды Гука Фіна“—Марка Твэна. Да другое—„Дзюрдзі“ Ажэшковай, „Марына з Грубога“ Тэтмаера, „Сьляпы Музыка“ Караленкі, беларускія апавяданьні Рэйзіна (з жыдоўскае мовы), „Кароль вугаль“ Сынклера і інш. Праектуецца распрацаваньне і трэцяе бібліатэчкі—папулярна-навуковае. Ды ўсё гэта—праграма на сёлетні год.

Чым тлумачыцца гэткае ажыўленьне ў беларускай выдавецкай працы? Дый якія гараскопы мае ў нас кніжка ў роднай мове?

Даўно мінуліся ўжо тыя часы, калі беларуская кніжка зьяўлялася як быццам толькі агітацыйным матэрыялам. Агітацыйным не па свайму зьместу: зьмест яе быў заўсёды вельмі рознародны і нікога агітаваць ня зьбіраўся. Не: агітаваў за беларускую справу самы факт выхаду ў сьвет беларускае кніжкі, — кніжкі, якая зразу ж захоплівала чытача тым, што была родная, блізкая і зразумелая для яго і па свайму духу і па мове. Дык ніхто і ня гнаўся за тым, каб беларуская кніжка дала выдаўцу даход, ці хоць аплаціла кошт выданьня. А раз так, дык выдавецкая работа — гэта была як-быццам прорва бяз дна, куды кідаліся з такім страшэнным высілкам дабываныя першымі адраджэнцамі грошы—без павароту! І затым работа гэная была заўсёды няпэўная, залежная ад прыпадковых прычын, і трудна было рабіць тыя ці другія шырэйшыя пляны, укладаць выдавецкія праграмы.

Першая спроба прыступіць да пляновае выдавецкае работы зроблена была ў 1906 г. ў Пецярбурзе суполкай „Загляне сонца і ў нашае ваконца“. Суполкай быў выданы рад кніжак — перадусім старэйшых аўтараў, а пасьля—Купалы, Бядулі і інш. Але кніжкі Суполкі выходзілі ня часта, бо капіталы яе былі дужа абмяжаваныя... Другая спроба зроблена заклаўзеным у Вільні ў 1913 годзе Беларускім Выдавецкім Таварыствам, якому ўдалося ад прыватнае асобы атрымаць адразу вялікшую суму грошы на друкаваньне кніжак, і вось мы бачым ізноў нейкае ажыўленьне: выходзе добрая жменя беларускіх арыгінальных твораў, якімі мы карыстаемся яшчэ і сягоньня. Але грошы вычарпаліся, а назад вярочаліся туга, дык праз пару гадоў выдавецкая праца ізноў затармазілася.

У 1919—1921 гадох бачым ізноў напружаную выдавецкую працу Т-ва: яно паставіла сабе мэтай здаволіць беларускія школы неабходнымі падручнікамі ды на гэта кінула ўсе свае грашовыя засобы. Але прыйшлі для беларускіх школаў благія часы, і апрача трох—чатырох гімназіяў і 1—2 пачатковых школак усе беларускія школы былі зьліквідаваны ўладай... І вось той капітал, які быў укладзены ў выданьне падручнікаў, аказаўся мёртвы, бяз руху, спыніўшы магчымасьць выдавецкае працы ізноў на колькі гадоў.

Аднак, беларускі адраджэнскі рух за апошнія гады пачаў вельмі шыбка пашырацца. Пачалася масавая арганізацыя беларускіх сіл і ў вёсцы і ў месьце. Пачалі тварыцца соткі народных бібліатэчак. Пачлося прыватнае вучэньне дзяцей у роднай мове. І вось кніжка беларуская ізноў пайшла ў ход. Выйшлі на сьвятло дзеннае заляжаўшыяся азбукі і чытанкі. З'усюль пачалі трэбаваць твораў беларускіх пісьменьнікаў. І ўсё — за плату, за грошы. Словам, кніжка беларуская на нашых вачох з „агітацыйнага матэрыялу“ ператварылася ў тавар — у рэч першае патрэбы. І вось узнаўляецца выдавецкі рух.

Аб росьце попыту на беларускую кніжку сьведчаць такія факты. Замест выдаванага звычайнага аднаго беларускага календара сёлета іх было: чатыры календары-кніжкі (тры — чыста беларускія і адзін — беларуска-расейскі), ды адзін адрыўны календар, які выйшаў у двух выданьнях. Першае выданьне адрыўнога календара, выпушчанага ў ліку 6.000 экз., разыйшлося ў працягу двух тыдняў. У другім выданьні яго—5.000 экзэмпляраў. Чытанка „Зорка“ выйшла адзінадцатым выданьнем — і то ў ліку 10.000 экз. Замест аднэй адзінай беларускай кнігарні Бел. Выд. Т-ва ў Вільні істнуюць сяньня ажно тры беларускія кнігарні, у тым ліку адна — прыватная. На правінцыі адчыніўся рад дробных кнігарняў...

Кніжка сталася ў нас ужо таварам, і ў гэтым — выяўленьне вялізарнага поступу ў беларускім адраджэнскім руху ў Заходняй Беларусі, ня кажучы ўжо аб Усходняй, дзе выдавецкая работа вядзецца ў шырокіх дзяржаўных рамках. І вось, праглядаючы гэтую жменьку новавыданых кніжок беларускіх, якія мне надовячы прынясьлі дзеля прагляду, я ня ўстрымаўся, каб не падзяліцца з грамадзянствам выявіўшымся новым фактам у нашым адраджэнскім руху.

Факт гэты — нязвычайна памысны: ён мусіць прыцягнуць да беларускае выдавецкае працы ня толькі грамадзкія грошы, з такім трудом здабываныя выдавецкімі арганізацыямі, але і прыватны капітал. Друкаваньне беларускіх кніжак можа даць даход прыватным прадпрыемцам, дый мы бачым ўжо спробы ў гэтым кірунку, робленыя паважнай выдавецкай фірмай Б. Клецкіна („Віленскае Выдавецтва“). А кожная новая кніжка — ведама, з вартым нечага зьместам, — гэта ж ёсьць паважны ўклад у нашу культурную скарбніцу, гэта той грунт, на якім будзе вырастаць беларуская думка і беларуская творчая праца наагул.

А. Н-а.

польскім карэспандэнтам“ — гэта-ж папросту публічная заява міністра — на спэцыяльна зробленай агульнай канфэрэнцыі яго з журналістамі. Дык, відаць, „гутарку“ чулі і іншыя журналісты. І вось, адзін з іх падае ў аднэй з бэрлінскіх газэт цікаўны дадатак да таго, што надрукавана ў польскіх газэтах, ды што, паводле ягоных слоў, таксама казаў міністар.

Латвійскі міністар быццам падробна тлумачыў, чаму „Латвія ды іншыя балтыцкія дзяржавы ня могуць шукаць апоры аб Польшчу“. Бо тады яны „павінны былі б паддацца ўплывам польскай палітыкі“. Які-я ж гэта „ўплывы“? Балтыцкія дзяржавы маюць дакладна азначаныя і пэўныя граніцы, абапёртыя на этнаграфічным складзе насяленьня. А вось Польшча, захапіўшы шмат чужых народнасьцяў — проці іх волі, — можа ўтрымліваць свае граніцы толькі ваеннай сілай. Гэткім чынам, калі-б балтыцкія дзяржавы мелі шукаць апоры ў Польшчы, тады над Балтыкай маглі-б стварыцца адносіны, як на Балканах... Чытай: Польшча йграла-б ролю Італіі... А гэта ўсё спарадзіла б усьцяжны стан няпэўнасьці і ваеннай трывогі для ўсіх балтыцкіх дзяржаваў...

„Роботнік“, паведамляючы аб гэтым, кажа, што „гэтая тэлеграма нямецкага агенцтва, відаць, сфальшавана“... Пэўне, пэўне...

Цікаўныя рэвэляцыі літоўскай газэты.

Газэта „Летува“, орган літоўскага ўраду, дае цікаўныя інфармацыі аб тым адказе, з якім латвійскі ўрад вярнуў польскаму ўраду апрацаваны апошнім праект латвійска-польскага гандлёвага трактату.

„Латвійскі ўрад выясьніў польскаму, што перагаворы з Польшчай аб заключэньні трактату ня могуць быць распачаты, пакуль Польшча ня згодзіцца на так-званыя „расейскую і балтыцкую засьцярогі“ латвійскага ўраду. А зьмест гэтых „засьцярогаў“ — у тым, што „**Латвія пакідае за сабой права заўсёды даць у сябе СССР і іншым балтыцкім дзяржавам вялікшыя гаспадарчыя і іншыя прывілеі, чым Польшчы**“..

Гэткім чынам, кажа газэта, сьпярша правалілося „ўсе палітычныя лятуценьні Польшчы над Балтыкай, (аб так-зван. „гэгеміі“), а цяпер спаткаў Польшчу і правал яе імкненьняў да эканамічнага ўціску балтыцкіх дзяржаваў“.

З тону ўрадавае літоўскае газэты неяк ня відаць прыхільнасьці да Польшчы...

Правакацыя літоўскіх фашыстаў.

„Роботніку“ пішуць з Рыгі, што ўсе арышты літоўскіх сацыялістаў і людоўцаў і быццам падрыхтаваны імі „камуністычны пераварот“ зьяўляюцца агіднай правакацыяй літоўскага фашыстаўскага ўраду. Шляхам фізычнага зьнішчэньня выдатнейшых сяброў абедзьвюх партыяў лявіцы літоўскі ўрад хоча ўмацаваць сваю ўладу, якая трымаецца толькі гвалтам. Дзеля таго ўсе спробы і заходы палітычных дзеячоў, каб перадаць справу арыштаваных у звычайны суд, але не ў „даразны“, спатыкаюцца з рашучым адпорам ураду. Пішуць, што адзіны ратунак для 60 арыштаваных, якім пагражае кара сьмерці, гэта—інтэрвэнцыя заграніцы...

Фашыстаўскі тэрор у Літве.

Літоўская паліцыя раскрыла новы „замах стану“. Сядзібай арганізацыі зьяўляецца м. Шаўлі. На чале арганізацыі стаяў выдатны палітычны дзеяч, пасол Сойму з партыі „людоўцаў“, Паюс. 3 красавіка — пад відам акружнога зьезду партыі людоўцаў—адбылася нарада арганізацыі. Пасьля гэтай нарады п. Паюс паехаў у Коўну, ды на вагзале быў тамака арыштаваны паліцыяй і — разам з сваей „нятыкальнасьцяй“—пасаджаны ў вастрог... Пасьля гэтага павадыр соймавай апазіцыі п. Толушыс заявіў пратэст перад урадам проці „нячуванага“ факту зламаньня канстытуцыі літоўскім урадам. У Коўні пануе абурэньне.

Так паведамляе аб літоўскім „нячуваным зламаньні канстытуцыі“ віленскае „Слово“, можа, яшчэ і абураючыся, разам з „цэлым местам Коўнай. Вось дык шляхотныя людзі і шчырыя абаронцы Канстытуцыі ды паэольскай нятыкальнасьці... у Літве—гэтыя паны, што пішуць у віленскім „Слове“.

Добрая навука.

Тое, што робіцца ў Літве яе фашыстаўскім урадам,—добрая навука ўсім сацыялістам. Пакуль фашысты садзілі ў вастрогі ды расстрэлівалі „камуністаў“, паны сацыялісты памагалі ўраду, як гэта робіцца ня толькі ў Літве, але, здаецца, усюды, асабліва—па суседзтву з СССР. А вось, калі фашысты неяк справіліся з „камуністамі“, дык зараз-жа ўзяліся за сацыялістаў, з якімі навет далёка менш цэрамоняцца, чым з камуністамі. Ужо першая ахвяра літоўскага фашызму пала: жыдоўскае агенцтва даносіць аб расстрэле—па прысуду „палявога суду“—сацыяліста Мэламэда. Двум іншым сацыялістам, таксама засуджаным на кару сьмерці, яна заменена вечнай катаргай... Але гэта-ж — толькі пачатак расправы: астаецца яшчэ каля 60 арыштаваных, якім усім пагражае расстрэл... Тады сацыялісты спалохаліся не на жарты. На парыжскай канфэрэнцыі сацыялістычнага Інтэрнацыяналу разважалася справа тэрору літоўскіх фашыстаў. Фінляндзкія, латвійскія і эстонскія сацыялістычныя арганізацыі тэлеграфавалі ў Парыж на канфэрэнцыю аб пагражаючым разгроме і крывавай расправе з сацыялізмам у Літве. Бюро Інтэрнацыяналу пастанавіла выдаць адозву да работнікаў усяго сьвету, каб слалі пратэсты і арганізавалі націск на свае ўрады, каб спыніць тэрор проці сацыялістаў у Літве.

Пастановы кангрэсу латвійскіх сацыялістаў.

У Рызе распачаўся кангрэс латвійскай сацыялістычнай партыі. Кангрэс прыняў рад рэзалюцыяў, у якіх—паміж іншым—пастанавіў прымаць і далей учасьце ў урадзе—дзеля правядзеньня ў жыцьцё рэальнай праграмы гэткага зьместу: барацьба з фашызмам у краі, эканамічная ўнія ўсіх балтыцкіх дзяржаваў (бяз Польшчы), безадкладнае заключэньне палітычнага і гаспадарчага трактату з ССРР, скарачэньне ваеннай службы і г. д.

Новы прэзыдэнт Латвіі.

У рэзультаце некалькіх галасаваньняў выбраны новы прэзыдэнт Латвійскай Рэспублікі, — Зэмгальс. — Кандыдатура яго была выстаўлена партыяй цэнтру, але за яго падалі галасы і сацыялісты і сялянскі саюз.

ХРОНІКА.

У СПРАВЕ ДАПАМОГІ ПАЦЯРПЕЎШЫМ АД НЕУРАДЖАЮ. **Да нас часта паступаюць пісьмы з вёскі з запытаньнямі, ці можна атрымаць дапамогу ад ураду пацярпеўшым ад неўраджаю сялянам. Вось-жа рэч гэтая — магчымая, але пастольку, паскольку галадаючыя сяляне самі будуць даходзіць належнае ім дапамогі. Хай сяляне згаворацца ўсей вёскай, выбяруць сваіх дэлегатаў і дамагаюцца праз сваю гмінную раду абвешчанае ўрадам помачы. Хіба-ж у кожнай вёсцы знойдзецца нехта больш граматны і разьвіты, хто здолее пакіраваць сялян у адпаведным кірунку.**

Перадчасная радасьць. Згодна з вестками польскае прэсы мы падалі ў папярэднім нумары вестку аб тым, што ўрад выдаў дэкрэт проці выкіданьня да 31 мая з дворных хат тых парабкоў, якіх на новы гаспадарчы год абшарнікі не нанялі нонова. Цяпер выясьняецца, што забарона выкіданьня абстаўлена гэтулькімі „калі“, што практычных вынікаў з дэкрэту трудна спадзявацца. Забарона датыча тых выпадкаў, калі абшарнік яшчэ не наняў сабе новых парабкоў, якія мусяць недзе жыць. Калі-ж ужо наняў, ды ня мае іншае вольнае хаты, дык стары парабак мусіць уступіць новаму.

Выходзе, што дэкрэт мае толькі „маральнае“ значэньне. На практыцы-ж усё будзе залежаць ад добрае волі абшарніка..

Да сьвяткаваньня 1-га Мая. Як падаюць віленскія польскія часопісі, віленская арганізацыя ППС мавілася правясьці сёлетняе сьвяткаваньне 1-га Мая—пад сваім партыйным сьцягам. Аднак, гэта не ўдаецца, бо ўжо незалежныя сацыялісты адмовіліся iсьці разам з пэпэсамі. Дык кожная партыя мае ладзіць свой асобны абход Сьвята Працы.

Забастоўка чысьціцеляў вагонаў. У прыватнай фірме, якая ўзяла ад Віленскай Дырэкцыі Чыгунак падрад на ачыстку вагонаў, забаставалі ўсе працаўнікі на віленскім вагзале. Бастуюць 43 асобы. Яны трэбуюць павялічэньня платы на 50-70 прац.

Чыгункавая адміністрацыя з'арганізавала атрад сваіх работніц, якія і пачалі рабіць ачыстку вагонаў. Гэта прымусіла забастоўшчыкаў вярнуцца да працы, нічога не дабіўшыся.

Забастоўка інструктароў „Помачы Працай“. Інструктары жыдоўскага дабрадзейнага таварыства „Помачы Працай“ у Вільні забаставалі, дамагаючыся павялічэньня платы. Управа Т-ва вядзе перагаворы з інструктарамі аб палюбоўным вырашэньні канфлікту.

Хвароба пасла Барана. Як нас паведамляюць з Горадні, пасол Сяргей Баран, які выйшаў з вастрогу з зусім зруйнаваным здароўем, ужо другі тыдзень ляжыць зусім хворы.

Асаблівая „ўступка“ беларусам. Паводле інфармацыі „Газ. Варш. Пор.“, віленскае школьнае куратарыум маніцца ўлетку ладзіць курсы беларускае мовы для тых вучыцялёў пачаткавых польскіх школаў, у якіх ёсьць значная лічба беларускіх дзяцей.

Дык, як відаць, „беларушчыць“ пачаткавыя школы для беларускіх дзяцей будуць акурат тыя самыя „пэдагогі“, якія дагэтуль займаліся спэцыяльна апалячываньнем нашых школьнікаў!

Добрае ж будзе гэнае „беларушчаньне“!

Публічныя лекцыі. Ведзеныя сыстэматычна публічныя лекцыі ў Цэнтральным Гуртку Т-ва Беларускае Школы ў Вільні з прычыны вялікодных сьвятаў прыпыняюцца да 30 красавіка. Пасьля перарыву расклад лекцыяў будзе такі:

У красавіку:

30-га: Расейцы і мы (д-р Я. Станкевіч).

У маі (траўні):

7-га: Найнавейшая беларуская паэзія (д-р І. Дварчанін).

14-га: Аўтарскі вечар маладых паэтаў.

21-га: Аб мастацтве (грам. Сергеевіч).

28-га: Вечар пасьвячоны творчасьці Максіма Багдановіча (ў 10 угодкі сьмерці Яго).

Лекцыі адбываюцца па суботам, у 7 гадз. увечары, у памяшчэньні Таварыства (вуліца сьв. Анны 2).

Перанялі абавязкі Паўлюкевіча! Сельсаюзьніцка-халэцкая прэса ў апошнія часы пераняла абавязак „доктара“ Паўлюкевіча, які ў сваім „Беларускім Слове“ займаўся спэцыяльна вылiваньнем усялякага бруду на асобу ведамага беларускага дзеяча грам. Луцкевіча, асабліва нямілага ўладам. Цяпер гэга ўзялі на сябе сельсаюзьнікі, якія ў кожным нумары „Сял. Нівы“ паўтараюць свае ілжывыя і ўжо выведзеныя на чыстую ваду брудныя закіды — аднаму з тварцоў беларускага адраджэнскага руху. Міма гэтае хлусьні кожын парадачны чалавек праходзе з агідай.

Афіцыяльны курс грошы на 11 красавіка. Даляр—8 зл. 89 гр. Залаты рубель — 4 зл. 60 гр.

11./IV на чорнай біржы ў Вільні за даляр плацілі 8,90. Зал. р. 4,70. Чырв. 3 дал. 90 цэн.

Сацыяльнае забясьпечаньне працоўных.

Урад маніцца пашырыць заданьні Касаў Хворых, якія цяпер даюць помач работнікам толькі ў выпадку хваробы застрахаваных у іх асоб і іх сем'яў,—так-жа і на выпадкі ўтраты здольнасьці да працы (інвалідзтва) і сьмерці застрахаванага карміцеля сям'і. Апрацаваны ўрадам праект закону аб гэтым разглядала надовячы Рада Касы Хворых места Вільні, пры чым прадстаўнікі застрахаваных работнікаў выступілі з абшырнай крытыкай урадавага праекту, ды запрапанавалі ўвясьці ў яго рад паважных зьменаў і папраўак.

Прадстаўнікі работнікаў адзначылі, як агульную рысу ўрадавага праекту, імкненьне ўраду зьменшыць межы самастойнасьці Касаў Хворых у іх гаспадарцы. Урад імкнецца правясьці такі прынцып, каб назначаныя ўправамі Касаў Хворых урадоўцы мелі як-быццам права нагляду над гэнымі ўправамі.

Адначасна ўрад хоча зусім пазбавіць управы Кас Хворых магчымасьці вызначаць штрафы тым прадпрыемцам, якія не аплачываюць у пару складак за сваіх работнікаў. Права караньня праектуецца даць... адміністрацыйным установам першае інстанцыі (старостам). Вось, работнікі сумляваюцца ў тым, каб адміністрацыя вельмі рупілася аб інтарэсы працоўных ды каб шчыра прымусіць прадпрыемцаў выпаўняць іх павіннасьці адносна да працаўнікоў.

Прадстаўнікі працоўных сумляваюцца так-жа, каб можна было зьменшыць складку за працаўнікоў да 6 проц., бо адначасна ўрад маніцца зьменшыць і ўчасьце дзяржаўнага скарбу ў фінансаваньні Касаў Хворых.

З свайго боку працоўныя асаблівую ўвагу зьвярнулі на дапамогу маткам пры цяжарнасьці і кармленьні дзяцей грудзьмі. Паміж іншым, яны прапануюць увясьці ўсюды станцыі апекі над маткай і дзяцём, што ўжо даўно зроблена на Захадзе.

У цэлым радзе папраўак прадстаўнікі працоўных стараліся пашырыць дапамогу застрахаваным і адваяваць самастойнасьць выбарных радаў і ўправаў Касаў Хворых.

Наадварот, прадстаўнікі прадпрыемцаў выступілі проці ўсяго гэнага праекту наагул, як проці перадчаснага і лішне абцяжаючага прамыслоўцаў.

Рада Касы Хворых, аднак-жа, прыняла ўсе папраўкі прадстаўнікоў застрахаваных працанікоў—большасьцяй 20 галасоў проці некалькіх, галасаваўшых проці пашырэньня сацыяльнага забясьпечаньня ці ўстрымаўшыхся ад галасаваньня.

Карэспандэнцыі.

Хадэкам непашанцавала.

(З Ваўкавыскага пав.).

14 сакавіка г. г. у м. Сьвіслачы пав. Ваўкавыскага хадэкі мелі зрабіць мітынг, аб якім абвесьцілі за некалькі дзён наперад. Уваход меў быць платны.

На „wiec“ той ніхто ня прыйшоў. Пасол Тадэуш Думоўскі, які спэцыяльна прыехаў на мітынг, бачучы, што ў салі, дзе меў быць „wiec“, на азначаны час ніхто ня прыбыў, — вышаў перад будынак нашай пажарнай старожы, каб хоць сваею асобаю (думаў што гэта паможа) засьвятлець перад Сьвіслачамі. Праўда, зараз каля яго скуль сь узяўся войт Сьвіслацкай гм., пара паліцэйскіх і адзін паўпанак. Па хвільцы да гэнай кумпаніі далучылася і некалькі простых сьмяротнікаў — беларусаў. Бачучы гэта, названы пасол сьцяміў, што можа пачынаць „працу“ і запрапанаваў прысутным (навет ужо бясплатна) пайсьці за ім у салю, дзе ён раскажа аб сучасным палажэньні „Polski“. Аднак, апрача войта, двох паліцэйскіх і шляхцюка, ніхто навет з мейсца ня скрануўся, а калі за ўвайшоўшымі зачыніліся дзьверы, — маленькі натоўп, які стаяў каля пажарнай старожы, дэманстрацыйна разышоўся, клянучы хадэкаў. З розных канцоў нёсься сьмех на скампрамітаваных ініцыятараў мітынгу, а сярод гоману чуліся словы: „годзі, мы даўно чулі вашы абяцанкі, цяпер ня ўдасцца ашукаць; языком — „Bóg і ojczyzna“, а рукамі — дзяры бяры“! Мітынг не адбыўся.

Характэрна тут адзначыць, што людзі, якія нядаўна яшчэ лічылі сябе „тутэйшымі палякамі“, таксама былі абураны на хадэкаў. Дый слушна!

Бо Хіена Пястоўская гідра беларускімі галасамі і галасамі ашуканых братоў нашых палякоў — атрымала і думае атрымаць большасьць у Сойме, а потым... потым пойдзе па сваей „уласнай“ праграме, ашуківаць наш народ і старацца трымаць яго ў цемры.

Дарэмна! Беларусы разбудзіліся, і перакананьне ў патрэбе лепшага жыцьця, сьвядомасьць нацыянальная і сацыяльная дасяглі такіх куткоў, дзе нядаўна яшчэ вы, паночкі, так трыўмфавалі. Народ зразумеў, хто запраўды дапаможа яму пакончыць з бядою.

І як вы не старайцеся, сколькі вы вашых „кулкаў“ не закладайце, сколькі агентаў вашых не пасылайце, — праца ваша лопне, як мыльны пузыр! **Чык-чык.**

Зьезд Т-ва Беларус. Школы ў м. Косаве.

20 сакавіка г. г. у м. Косаве адбыўся зьезд сяброў Т-ва Беларускае Школы Косаўскага павету. Ня гледзячы на мокрую пагоду і веснавое разводзьдзе, сабралася з розных куткоў Косаўскага павету каля 90 дэлегатаў. Трэба адзначыць, што Косаўскі павет мае найбольшы лік Гурткоў Т-ва Беларускае Школы з усіх паветаў і наагул там за апошнія гады рух беларускі ўзрос вельмі сільна. Прадстаўнікі з паадзінокіх Гурткоў Т-ва з усіх куткоў павету робяць вельмі добрае ўражаньне. Гэта зусім сьвядомыя беларусы і сьвядомыя грамадзяне. Яны сьвядомы мэтаў Т-ва, яго ролі ў сучасным беларускім руху і сьвядомы заданьняў яго. Яны добра разумеюць свае абавязкі, як сябры Т-ва. Яны самі імкнуцца да асьветы, да культуры, бо разумеюць, што гэтым толькі можна будзе палепшыць свой дабрабыт матар'яльны і духовы. На сходах трымаюцца салідна, паважна, відаць, што зусім добра ацэніваюць важнасьць і патрэбу яго. Адным словам Косаўскі зьезд вельмі добра пакаваў, на колькі ўзрасьлі беларускія працоўныя масы ў сэньсе беларускасьці і грамадзкасьці.

Сход адчыніў кароткай, але сакавітай прамовай старшыня Т-ва Беларускае Школы сэнатар Уласаў. У прамове гэтай ён выказваў сваю радасьць, што зярняты, кінутыя ў Беларускую Народную Ніву „Нашаніўцамі“, далі такі багаты ўраджай. Ня менш былі захоплены і дэлегаты зьезду, бачучы ў асобе сэнатара Уласава прадстаўніка першых барацьбітаў за долю і волю Беларускага Народу.

Па выбары прэзыдыуму сходу прадстаўнік Галоўнае Управы Т-ва грам. Жыткевіч зрабіў даклад аб працы Т-ва, пасьля чаго адбыліся выбары Косаўскай Акружной Управы Т-ва і Наглядная Рады яе. У Акружную Управу ўвайшлі:

Старшыня—Мажэйка Міхась з в. Скураты, віцэ-старшыня—Казімірчык Захар, віцэ-старшыня Трында Міхась, сэкрэтар—Дыльна Павал, заступнік сэкрэтара — Казімерчык Мар'я, скарбнік — Турбіна Мар'я, заступнік скарбніка Куіс Сьцяпан і кандыдаты: Кавальчук Антон і Казімерчык Янка.

У Наглядную Раду выбраны: старшыня—Жыгар Пётра, сэкрэтар — Осіпік Рыгор, сябры: Труцька Пётра, Бык Аляксей і Козік Тодар.

Далей была вынесена рэзалюцыя аб тым, што ўсе сябры мусяць прыймаць жывы ўдзел у працы Т-ва Беларускай Школы і мусяць старацца ўнасіць сяброўскія складкі і ахвяры на мэты Т-ва. На канцы зьезду ўсе прадстаўнікі зьезду разам з прадстаўнікамі Галоўнае Управы Т-ва зьняліся, каб увекавечыць памяць аб першых масавых кроках на Беларускай Культурна-Асьветнай Ніве.

Цяпер косаўцы ніяк ня могуць дачакацца таго часу, калі будуць зроблены ўсе адміністрацыйныя фармальнасьці і будзе залегалізавана Косаўская Акружная Управа і калі яны змогуць прыступіць да працы.

Косавец.

Рэдактар-Выдавец: С. Татарын.

Друкарня Я. Левіна, Вільня, Нямецкая 22.